ПРАЛЕТАРЫІ УСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, КАМСАМОЛЬСКАГА І ПРАФСАЮЗНЫХ КАМІТЭТАЎ БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

ГАЗЕТА ЎЗНАГАРОДЖАНА ГАНАРОВАЙ ГРАМАТАЙ ВЯРХОЎНАГА САВЕТА БССР

1985
11

КРАСАВІКА
ЧАЦВЕР
№ 13 (1463)

ВЫДАЕЦЦА З 1922 ГОДА

ВУЧОБА — ГАЛОЎНАЯ ПРАЦА СТУДЭНТА

«ВЫХОЎВАЕМ ГАСПАДАРОЎ СВАЁЙ ЗЯМЛІ»

Сярод студэнтаў БДУ імя У. І. Леніна не многа тых, хто пасля выпуску будзе займацца непасрэдна пытаннямі эканомікі. У гэты абмежаваны кантынгент уваходзяць будучыя географы, што спецыялізуюцца на кафедры эканамічнай геаграфіі СССР. Аб тым, як ідзе падрыхтоўка спецыялістаў — наш сённяшні расказ з каментарыямі выкладчыка кафедры, дацэнта Н. І. ЖУРАЎСКАЙ.

ПРА НАШУ любоў да зямлі мы гаворым часта і многа. Але ці задумваліся мы хоць раз аб сапраўднай цане зямлі? Ну хаця б аднаго гектара? З пункту гледжання эканамістаў. Наўрад. Хаця ад гэтага ні вартасць, ні кошт названай плошчы не сталі ніжэй. Думаецца, будзе не лішнім нагадаць, што толькі адзін гектар рысавага поля на Кубані каштуе прыкладна столькі ж, колькі і новенькія «Жыгулі». Ураўвае?

— Безумоўна. Апроч усяго, наводзіць на роздум, колькі яшчэ неабходна зведаць нашым студэнтам. Сярод паступаючых на наш факультэт — большасць гараджане. А ці багатыя пазнанні ў сельскага абітурыента з семнаццацігадовым жыццёвым багажом, у якім толькі вучоба ў дзесяцігоддзі? Такі партрэт сярэдняга студэнта, які пажадаў набыць спецыяльнасць географа.

Фундамент для ведаў, як бачна, трывалым не назавеш. Таму ўсё, пачынаючы з самых простых ісцін, студэнту даводзіцца спасцігаць на факультэце. Не толькі на лекцыях і семінарскіх занятках па палітэканоміі, эканамічнай геаграфіі. Вялікія задачы закліканы тут вырашаць вытворчая практыка.

На трэцім курсе — спецыялізацыя. Хлопец ці дзяўчына канчаткова вырашае для сябе, які кірунак на шляху да дыплома абраць. Прыкладна пяцьдзесят чалавек з дзённага аддзялення выбіраюць эканамічную геаграфію.

Пасля тэарэтычнага спасцiжэння эканамічных ведаў практыка здаецца сапраўдным падарункам лёсу. Аднак з першых яе дзён практыкантам даводзіцца сутыкнуцца падчас з такой рэчаіснасцю, пра якую ні ў адным падручніку не прачытаеш. Што ні прадпрыемства — свае клопаты і турботы, якія ніхто не хавае ад студэнта. Гэта ж не праверка, чаго баяцца?

— Было б памылковым думаць, што практыка ператвараецца для трэцякурсніка ў нейкі лікбез. На карысць гэтага сведчыць і той факт, што яна — пачатак збору канкрэтнага матэрыялу для дыпломнай работы, якая два наступныя гады будзе пашырацца і дапрацоўвацца. У гэты перыяд прадметы студэнцкіх даследаванняў будуць адлюстроўвацца ў курсавых работах, навуковых дакладах.

Усё так. Але разрыў тэорыі, якая даецца студэнтам у час вучобы, з практыкай — значны. Хаця, здаецца, за плячыма — курс палітэканоміі, аб узроўні ведаў якой сведчыць добрая ці выдатная адзнака ў залікоўцы. Веданне сапраўднага становішча спраў не заўсёды атаясамліваецца з выстаўленымі чацвёркамі і пяцёркамі.

— У чым тут прычына? Адназначна адказаць нельга. Калі ж падрабязна разглядаць пытанне, адным з першых фактараў давядзецца назваць засяроджанне выкладчыкаў грамадскіх дысцыплін на чыста навуковых пытаннях, выкладаемых чыста навуковай мовай. Тут бы самы час падмацаваць свае выкладкі прыкладам з практыкі пэўнага калектыву, прадпрыемства. На жаль, такіх ведаў асобным выкладчыкам падчас вельмі і вельмі бракуе. А навучыць эканоміцы, эканамічнаму мысленню ў адрыве ад рэальнага жыцця немагчыма.

Вернемся, аднак, да пачатку нашай размовы. За некалькі тыдняў практыкі студэнты запішуць у свае дзённікі ўсё ўбачанае і пачутае. Прымераюць гэта да сваіх ведаў і зробяць адпаведныя вывады, якія лягуць у аснову справаздач. Але гэтым справа не скончыцца. Будуць яшчэ пасяджэнні гуртка пры кафедры эканамічнай геаграфіі, будуць узнімацца праблемы, нават магчымыя шляхі іх ухілення. Будуць пытанні і адказы. Карацей кажучы, студэнты вучацца думаць самастойна. Разумна.

Такая вось пранікнёная размова адбылася нядаўна на пасяджэнні гуртка, дзе разглядаліся асаблівасці развіцця аграпрамысловага комплексу Гомельскай вобласці. Даклад студэнткі 4-га курса Ірыны Малышавай аб праблемах і перспектывах развіцця мясамалочнай прамысловасці рэгіёна быў даволі вычарпальны нават з пункту гледжання спецыяліста. Ірыну за трыбунай змяніла Таццяна Якавец, староста гуртка. Яе думкі вызначаліся не меншай сур'ёзнасцю, аналізам спраў бульбаводаў вобласці.

— Гурток дапамагае праверыць вартасць уласных думак і вывадаў, якія ацэняць ці аспрэчаць твае ж сябры. Але нават не ў гэтым галоўнае прызначэнне нашай работы. Галоўнае, што мы выхоўваем сапраўдных гаспадароў сваёй зямлі. І не важна, дзе яны будуць працаваць — у школах, ВНУ ці НДІ.

В. УЛАДЗІМІРАЎ,
наш кар.

УСЕСАЮЗНАЯ НАВУКОВА-МЕТАДЫЧНАЯ КАНФЕРЭНЦЫЯ

РЫХТАВАЦЬ ДАСТОЙНУЮ ЗМЕНУ

АКТУАЛЬНЫМ ПРАБЛЕМАМ маральнага выхавання студэнцкай моладзі была прысвечана Усесаюзная навукова-метадычная канферэнцыя, якая прайшла ў Мінску. У ёй удзельнічалі прадстаўнікі многіх вядучых вучэбных цэнтраў краіны.

— На канферэнцыі выпрацаваны канкрэтныя рэкамендацыі, якія будуць улічаны ў практыцы работы вышэйшай школы, — сказаў у гутарцы з карэспандэнтам БЕЛТА старшыня аргкамітэта канферэнцыі начальнік Галоўнага ўпраўлення выкладання грамадскіх навук Міністэрства вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі СССР Г. Г. Квасаў. — На агульную думку ўдзельнікаў, неабходна прыняць меры для далейшага ўзмацнення марксісцка-ленінскай светапоглядная накіраванасці ўсіх выкладаемых дысцыплін, павышэння іх этычнага і маральнага значэння. Асаблівая ўвага павінна быць удзелена рашучаму ўздыму актыўнасці і самастойнасці ў рабоце камсамольскіх арганізацый ВНУ, развіццю студэнцкага самакіравання.

Прызнана мэтазгодным у бліжэйшы час распрацаваць тыпавую праграму вузаўскага курса «Асновы марксісцка-ленінскай этыкі», прымаючы пад увагу, у прыватнасці, патрабаванні рэформы агульнаадукацыйнай і прафесіянальнай школы. Гэта дысцыпліна з цягам часу павінна стаць абавязковай ва ўсіх навучальных установах.

Звернута ўвага на неабходнасць мер, накіраваных на актыўнае далучэнне студэнтаў да працы ў пазавучэбны час, на ўзмацненне контрпрапагандысцкай работы. У прынятых рашэннях высока ацэнен і рэкамендаван да пашырэння вопыт вышэйшай і сярэдняй школы Беларусі ў арганізацыі этычнай адукацыі, маральнага і ваенна-патрыятычнага выхавання падрастаючага пакалення. (БЕЛТА).

НА ЗДЫМКАХ: у час пленарнага пасяджэння канферэнцыі.

Фота А. ВАЛОШЫНА.

Беларускі універсітэт тэлетайп

УЧОРА · СЁННЯ · ЗАЎТРА

АДБЫЎСЯ ПЛЕНУМ

камітэта камсамола універсітэта. На ім была разгледжана работа камсамольскай арганізацыі універсітэта па далейшаму ўдасканаленню ваенна-патрыятычнага і інтэрнацыянальнага выхавання студэнтаў у святле падрыхтоўкі да 40-годдзя Перамогі савецкага народа ў Вялікай Айчыннай вайне, XII Сусветнага фестывалю моладзі і студэнтаў у Маскве.

Ю. КАЎТУНЕНКА,
член прэс-цэнтра камітэта камсамола.

ВОПЫТАМ РАБОТЫ

рэдкалегіі насценнай газеты «Vita» на вучобе рэдактараў факультэцкіх газет падзялілася рэдактар Людміла Багданец. Былі разгледжаны асобныя пытанні тэорыі і практыкі савецкай журналістыкі, дадзены парады рэдактарам.

С. БАЛЦЭВІЧ,
член прэс-цэнтра камітэта камсамола універсітэта.

ДЗЕНЬ АДКРЫТЫХ ДЗВЯРЭЙ

прайшоў на фізічным факультэце нашага універсітэта. Вучні старэйшых класаў, выпускнікі сярэдніх школ даведаліся аб спецыялізацыях, па якіх вядзецца падрыхтоўка на факультэце, азнаёміліся з кафедрамі і лабараторыямі, сустрэліся з вядучымі вучонымі фізфака.

І. САВОСЦЕНКА.

НА ПАЦВЯРДЖЭННЕ ЗВАННЯ

«народны» паспяхова выступілі з канцэртнымі праграмамі калектывы мастацкай самадзейнасці універсітэта — народны аркестр народных інструментаў і народная харавая капэла. Праграмы былі прысвечаны 40-годдзю Перамогі савецкага народа ў Вялікай Айчыннай вайне. Камісія дала высокую ацэнку выканаўчаму майстэрству ўдзельнікаў мастацкай самадзейнасці.

Э. АНІСЕНКА.

ВЫДАТНА ВЫСТУПІЛІ

на першынстве ВНУ рэспублікі па фехтаванню студэнты А. Паранін (юрфак), С. Коваль (фізфак), М. Фабрыкант (мехмат), А. Мядзведзеў, У. Папрацінскі (ФПМ) і супрацоўнік С. Элчакян. У выніку каманда нашага універсітэта заняла другое месца.

У. ШЛЕНСКІ,
трэнер каманды.

МАСТАЦКАЯ САМАДЗЕЙНАСЦЬ

ВЫДАТНЫХ ВЫСТУПЛЕННЯЎ!

ІДУЧЫ НАСУСТРАЧ 40-годдзю Перамогі савецкага народа ў Вялікай Айчыннай вайне, рэктарат, партком, прафком, камітэт камсамола і праўленне студэнцкага клуба універсітэта праводзяць фестываль ваенна-патрыятычнай песні.

Мэтай фестывалю з'яўляецца прапаганда савецкага гераіка-патрыятычнага музычнага мастацтва, паглыбленне ведаў моладзі аб сусветна-гістарычным значэнні Вялікай Перамогі, вызваленчай місіі Савецкай Арміі, кіруючай ролі КПСС — арганізатара і натхняльніка Перамогі савецкага народа, яго барацьбы за мір і сацыяльны прагрэс.

Фестываль будзе праводзіцца ў актавай зале БДУ імя У. І. Леніна з 22 па 27 красавіка ў тры этапы. І этап — конкурс паміж факультэтамі на лепшае выкананне ваенна-патрыятычнай песні (з 22 па 24 красавіка); ІІ этап — удзел у фестывалі прадстаўнікоў вышэйшых навучальных устаноў г. Мінска (з 25 па 26 красавіка); ІІІ этап — заключны канцэрт пераможцаў і лаўрэатаў фестывалю (27 красавіка).

Працягласць конкурснай праграмы — не больш 30 мінут. Усе ўдзельнікі фестывалю паказваюць не больш як два творы.

Судзейства ажыццяўляе журы. У яго састаў уваходзяць прадстаўнікі грамадскіх і творчых арганізацый г. Мінска. Нумары салістаў-вакалістаў, дуэтаў, трыо, квартэтаў ацэньваюцца па 10-бальнай сістэме. Выступленні вакальных і вакальна-інструментальных ансамбляў — па 15-бальнай, выступленні хораў — па 20-бальнай сістэме. Ацэньваючы конкурсную праграму, журы ўлічвае выкананне конкурсных умоў і майстэрства выканаўцаў.

Калектыў мастацкай самадзейнасці факультэта, заняўшага І месца, узнагароджваецца пераходным Чырвоным сцягам прафкома універсітэта, Ганаровай граматай і грашовай прэміяй 200 рублёў. Калектывы, якія занялі ІІ і ІІІ месцы, узнагароджваюцца Ганаровымі граматамі і грашовымі прэміямі рэктарата 150 і 100 рублёў адпаведна.

Зацверджаны спецыяльныя прызы: харавому калектыву — прыз камітэта камсамола, вакальнаму і вакальна-інструментальнаму ансамблям за выкананне твораў беларускіх аўтараў, аўтару самадзейнай песні — прыз прафкома, лепшым салістам-вакалістам, дуэтам, трыо, квартэтам — прызы рэктарата.

Лепшыя калектывы і выканаўцы прымуць удзел у заключным канцэрце фестывалю, прысвечанага 40-годдзю Перамогі савецкага народа ў Вялікай Айчыннай вайне.

У. МАКАРЭВІЧ.

НАСУСТРАЧ 40-ГОДДЗЮ ПЕРАМОГІ



РАЎНЕННЕ НА СЦЯГІ ПЕРАМОГІ!

ГЭТА НАША З ТАБОЙ БІЯГРАФІЯ...

ЗА ДОЎГУЮ ЗІМУ універсітэцкі двор упершыню выглядаў так урачыста і прыгожа. Ад подыху ветру трапяталі флагі, якія трымалі ў руках юнакі і дзяўчаты — тыя, хто сабраўся на ўрачысты мітынг. Ва універсітэт пасля дальняй дарогі павінны прыбыць сцягі Перамогі. Доўгі час гэтыя пунсовыя палотны ляжалі ў сховішчах Цэнтральнага музея Узброеных Сіл СССР, а пасля таго, як 27 снежня 1984 года ў горадзе Барысаве адбылося ўрачыстае адкрыццё акцыі «Раўненне на сцягі Перамогі!», яны пабывалі ў Крупскім, Смалявіцкім, Бярэзінскім, Чэрвеньскім, Пухавіцкім, Мінскім і ў многіх іншых раёнах і гарадах Беларусі. І вось іх сустракае універсітэт.

Вялікі дзень! Мы так яго
назвалі,
Прад ім сцяною дым
парахавы,
Над попелам, гар'ю,
грудамі развалін
Ім быў падняты сцяг
Перамогі баявы!

На плошчы паяўляюцца сцягі. Адкрывае мітынг сакратар камітэта камсамола універсітэта Аляксандр Казулін:

— У Перамогі ёсць імёны. Яны золатам высечаны на абеліскаў. Імёны гэтыя — гонар наш, гераічнае мінулае Айчыны, на прыкладзе якога мы вучымся жыць, любіць сваю Радзіму беззапаветна і мужна. У Перамогі ёсць і сцяг. Ён сатканы з тысяч баявых сцягоў часцей і падраздзяленняў, якія змагаліся на франтах Вялікай Айчыннай. Гэтыя сцягі, прастрэленыя кулямі, пачарнеўшыя ад пораху, хвалююць да глыбіні душы. Міжволі ўяўляеш сабе людзей, якія пранеслі іх ад сцен Масквы да рэйхстага, людзей, без якіх не было б нашай Перамогі.

— Пунсовыя сцягі... Калі бачыш іх, яшчэ больш адчуваеш цану Перамогі. Сцяг — гэта сімвал доблесці, сімвал самаадданага служэння Радзіме. Так, як пад гэтымі сцягамі старэйшае пакаленне адваёўвала мір у суровыя саракавыя гады, мы, моладзь васьмідзесятых, гатовы абараніць яго сёння.— Гэтыя словы належаць студэнту пятага курса факультэта прыкладной матэматыкі Мікалаю Дземешу.

— Баявыя сцягі, пад якімі нашы дзяды і бацькі прысягалі на вернасць Радзіме, зноў у страі,— сказаў Канстанцін Кніга, студэнт першага курса юрыдычнага факультэта, кавалер ордэна Чырвонай Зоркі.— Гэтыя свяшчэнныя рэліквіі натхняюць нас на працоўныя і ратныя справы. Пад чырвонымі сцягамі савецкія воіны сцерагуць заваёвы сацыялізму. Ад імя ўсёй моладзі універсітэта хачу сказаць, што мы будзем дастойныя вялікага подзвігу сваіх бацькоў.

А потым настаў самы хвалюючы момант. Паступае каманда «Падрыхтавацца да перадачы сцягоў!». Іх атрымліваюць лепшыя студэнты універсітэта. Правафланговыя універсітэцкія групы фатаграфуюцца на фоне разгорнутых сцягоў.

Пунсовы сцяг, бязмежная вера ў правату сваёй справы, перакананасць у канчатковай перамозе камунізму — сталі невычэрпнай крыніцай сілы для Салдатаў Перамогі. Для кожнага з нас дэвізам жыцця павінны стаць словы «Раўненне на сцягі Перамогі!».

А. МАТУСЕВІЧ,
наш кар.

НА ЗДЫМКАХ: ускладанне кветак да помніка выкладчыкам і студэнтам універсітэта, якія загінулі ў гады Вялікай Айчыннай вайны; сцягі ў надзейных руках; раўненне на сцягі Перамогі.

Фота А. ВАЛОШЫНА.

НАШЫ ІНТЭРВ'Ю

ВАЗЬМІ Ў СПАДЧЫНУ ПАМЯЦЬ

Менш за месяц засталося да таго дня, калі савецкі народ будзе святкаваць 40-годдзе Вялікай Перамогі. Як да гэтай слаўнай даты рыхтуецца моладзь універсітэта? Якую работу ў гэтым напрамку праводзіць камітэт камсамола? Наш карэспандэнт звярнуўся з просьбай адказаць на гэтыя пытанні да намесніка сакратара камітэта камсамола універсітэта па ідэалагічнай рабоце А. МАЛЯРЭВІЧА.

— У 1984 годзе ва універсітэце прайшло 267 сустрэч з ветэранамі Вялікай Айчыннай вайны, арганізавана больш чым 30 тэматычных вечароў, у якіх прынялі ўдзел каля 15 тысяч студэнтаў. Часта перад студэнцкай аўдыторыяй выступаюць Героі Савецкага Саюза М. Я. Зайцаў, Д. П. Жмуроўскі, ветэраны І. В. Марчанка, Я. А. Піскуноў, Н. Ц. Нічыпарэнка і многія іншыя.

Камсамольскія арганізацыі універсітэта, факультэтаў працуюць у цесным кантакце з партыйнай арганізацыяй, саветам ветэранаў вайны. Гэта дае магчымасць на высокім ідэйным і арганізацыйным узроўні праводзіць навукова-практычныя канферэнцыі і канферэнцыі чытачоў па гераіка-патрыятычнай тэматыцы. Такія канферэнцыі прайшлі на кожным факультэце.

Традыцыйнымі на філалагічным факультэце сталі ўрокі мужнасці для студэнтаў першага курса, сустрэчы з ветэранамі ў залах музея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны. Ва універсітэце праходзіць аперацыя «Пагаворым, таварыш ветэран!».

— Аб рашэнні праводзіць гэтую аперацыю было заяўлена з трыбуны XXXI справаздачна-выбарнай камсамольскай канферэнцыі. Што можна сказаць сёння аб яе правядзенні?

— З сярэдзіны лютага прыступілі да работы на філалагічным факультэце, ФПМ, мехмаце. Студэнты ФПМ разаслалі, напрыклад, усім сваім ветэранам паштоўкі-віншаванні з 67-й гадавінай Савецкай Арміі і Ваенна-Марскога Флоту. Аператыўна ўключыліся ў правядзенне аперацыі на хімфаку і факультэце радыёфізікі і электронікі.

Хочацца назваць яшчэ некаторыя справы камсамольцаў. Студэнты гістарычнага факультэта ўзялі сваім калектыўным даручэннем шэфства над узвядзеннем помніка Перамогі на праспекце Машэрава. Кожны дзень група студэнтаў-гісторыкаў працуе на будаўніцтве гэтага мемарыяла. Камсамольцы механіка-матэматычнага факультэта і хімфака шэфствуюць над акруговым шпіталем ветэранаў вайны ў г. п. Бараўляны. У час зімовых канікулаў атрад студэнтаў гэтых факультэтаў працаваў у новым корпусе. Зараз спецыяльныя групы студэнтак-санітарак кожны дзень працуюць у шпіталі.

— З кожным годам расце ва універсітэце колькасць удзельнікаў зорных паходаў па месцах рэвалюцыйнай і баявой славы савецкага народа, больш шырокай становіцца геаграфія паходаў.

— Групы студэнтаў прайшлі па месцах баёў і партызанскімі сцяжынкамі не толькі па тэрыторыі Беларусі, але і братніх рэспублік — Украіны, РСФСР, Прыбалтыкі. Маршрутамі подзвігу ў мінулым годзе прайшлі 233 студэнты і супрацоўнікі універсітэта (25 груп), а толькі ў студзені-лютым гэтага года такіх груп было 13. Удзельнікі паходу-85 сустрэліся і запісалі ўспаміны 47 ветэранаў вайны, добраўпарадкавалі 16 помнікаў і абеліскаў, вялі вялікую прапагандысцкую работу. Лепшымі групамі універсітэта па выніках зімовага паходу прызнаны групы гістарычнага факультэта, кіраўнікі В. Буйко, Л. Барушка.

Інтэрв'ю правяла
А. ПАДАЛКА.

КРАСАВІК: НА ПАРАДАК ДНЯ КАМСОРГА

ЗВЕРЫМ ПЛАНЫ

УСЁ БЛІЖЭЙ і бліжэй да нас той знамянальны дзень, калі ўвесь савецкі народ адзначыць свята Вялікай Перамогі. Зараз ва ўсіх камсамольскіх арганізацыях універсітэта праходзяць сустрэчы з ветэранамі, абмеркаванне кніг на ваенную тэматыку, конкурсы патрыятычнай песні. Камсамольскія групы актыўна ўключыліся ў аперацыю «Пагаворым, таварыш ветэран!». Камсорг, ты добра растлумачыў, што мэта гэтай аперацыі ў тым, каб кожны камсамолец сустрэўся з удзельнікам Вялікай Айчыннай вайны, раздзяліў яго клопаты, сэрцам дакрануўся да падзей саракагадовай даўнасці? Галоўнае, каб кожны пасля такой сустрэчы не толькі розумам, але і душой адчуў сваю прыналежнасць да вялікага подзвігу народа.

У красавіку пройдуць стаўшыя ўжо традыцыйнымі спаборніцтвы па ваенна-прыкладному дваябор'ю (крос, стральба) на прыз Героя Савецкага Саюза Д. П. Жмуроўскага, а таксама вялікім святам камсамоліі універсітэта стане інтэрнацыянальны студэнцкі кірмаш, прысвечаны 40-годдзю Перамогі і XII Сусветнаму фестывалю моладзі і студэнтаў у Маскве.

Кожны год вясновымі днямі праходзяць ва універсітэце навуковыя канферэнцыі, прысвечаныя дню нараджэння У. І. Леніна. Камсорг, ты ведаеш, колькі студэнтаў, з якімі дакладамі выступяць на 42-й навуковай канферэнцыі? Ты пацікавіўся падрыхтоўкай гэтых дакладаў? Магчыма, такое пытанне ты паставіў для абмеркавання на камсамольскім сходзе?

«Гатовы да правядзення камуністычнага суботніка» — такія лаканічныя рапарты паступаюць зараз з усіх куткоў краіны ў Цэнтральны штаб па падрыхтоўцы суботніка. А як рыхтуецца да гэтага свята працы студэнцкая моладзь? Які ўклад камсамолія універсітэта ўнясе ў агульную справу краіны? Дзе будзе працаваць твая група, камсорг? Ты настроіў камсамольцаў на баявы, працоўны лад?

Багата ў цябе спраў, камсорг! За мноствам праводзімых мерапрыемстваў будзь уважлівым, не упускай з поля зроку ніводнага камсамольца, строга сачы за выкананнем ім кожнага даручэння, ці гэта даручэнне пастаяннае, ці часовае. Камсамольскае даручэнне не павінна быць папяровай справай. Патрабуй ад кожнага камсамольца яго выканання не на словах, а на справе. Пастаў пытанне аб выкананні даручэнняў на парадак дня камсамольскага сходу красавіка.

І яшчэ. Рыхтуючыся да сустрэчы 40-годдзя Перамогі, камітэт камсамола універсітэта лічыць сваёй галоўнай задачай, каб кожны камсамолец, студэнт, кожны факультэт, кожная група мелі сваю канкрэтную справу. Якую справу мае твая група? Ці гатовы ты рапартаваць аб выкананні яе на перадсвяточнай пераклічцы факультэтаў?

ПРЭМ'ЕРА КНІГІ

«ГІСТОРЫЯ — памяць народа, а памяць — кладоўка вопыту. Без ведання мінулага немагчыма будаваць будучае». Гэтыя словы К. Т. Мазурава часта гучалі ў той дзень у адной з самых прасторных аўдыторый БДУ імя У. І. Леніна, дзе адбылася першая канферэнцыя чытачоў па яго кнізе «Незабыўнае».

НА ЗДЫМКУ: удзельнікі канферэнцыі чытачоў па кнізе «Незабыўнае».

Фота А. ВАЛОШЫНА.

80-ГОДДЗЮ РЭВАЛЮЦЫІ 1905—1907 ГГ. ПРЫСВЯЧАЕЦЦА

Увага: віктарына

Пярвічная арганізацыя таварыства аховы помнікаў гісторыі і культуры БДУ імя У. І. Леніна, кафедра гісторыі СССР дасавецкага перыяду і газета «Беларускі універсітэт» праводзяць віктарыну, прысвечаную 80-годдзю рэвалюцыі 1905—1907 гг. у Расіі.

Просім адказаць на наступныя пытанні:

1. У якіх творах У. І. Леніна абагульнены вопыт рэвалюцыі 1905—1907 гг. у Расіі?

2. Раскажыце аб помніку У. І. Леніну на плошчы Леніна ў Мінску і аб яго стваральніках. Якія прадпрыемствы і ўстановы Мінска носяць імя Леніна?

3. Раскажыце аб помніках і мемарыяльных дошках Ф. Э. Дзяржынскаму ў Мінску.

4. Якія вышэйшыя навучальныя ўстановы Беларусі носяць імёны прафесійных рэвалюцыянераў, саратнікаў У. І. Леніна, актыўных удзельнікаў рэвалюцыі 1905—1907 гг. у Расіі?

5. Калі быў адкрыты Домузей І з'езда РСДРП? Раскажыце аб яго экспазіцыі.

6. Як увекавечана памяць мінчан аб прафесійным рэвалюцыянеры, савецкім партыйным і дзяржаўным дзеячы, які ўзначаліў у гады першай расійскай рэвалюцыі Баявую тэхнічную групу пры ЦК РСДРП?

7. Што вы ведаеце аб помніку М. І. Калініну на плошчы Калініна ў Мінску? На якіх гарадскіх будынках устаноўлены мемарыяльныя дошкі ў гонар М. І. Калініна?

8. Якая вуліца жылога масіву Паўднёвы Захад носіць імя ўдзельніка трох рэвалюцый, аднаго з першых у Беларусі Герояў Сацыялістычнай Працы?

9. Як увекавечана ў Мінску памяць аб прафесійным рэвалюцыянеры, адным з арганізатараў Іванава - Вазнясенскай стачкі 1905 г., савецкім партыйным, дзяржаўным і ваенным дзеячы?

10. Раскажыце аб удзеле ў першай рускай рэвалюцыі вучня і саратніка У. І. Леніна, агента ленінскай «Искры», расстралянага царскімі карнікамі ў Сібіры 18 студзеня 1906 года. Вуліцы якіх гарадоў носяць імя бясстрашнага рэвалюцыянера?

11. Раскажыце аб удзеле ў рэвалюцыі 1905—1907 гг. А. С. Пашкевіч (Цёткі). Дзе ўзведзены помнікі беларускай паэтэсе-рэвалюцыянерцы? Якія навучальныя ўстановы Беларусі носяць яе імя?

12. Якая з вуліц Заводскага раёна Мінска названа партыйным псеўданімам актыўнага ўдзельніка рэвалюцыі 1905—1907 гг. у Пярмі і Харкаве?

Адказы дасылаць да 15 мая на кафедру гісторыі СССР дасавецкага перыяду (галоўны корпус, аўд. 404). Пераможцы віктарыны будуць узнагароджаны граматамі і сувенірамі.

І НА ВЫНАС РОЗНІЦУ

фельетон

СТАТЫСТЫКА ВЕДАЕ ЎСЁ. Дакладна падлічана, пасля колькіх дзён, месяцаў, гадоў знаёмства ідзём у ЗАГС, колькі спім і працуем, размаўляем па тэлефоне і проста менцім языком. Статыстыкай падлічана, колькі студэнтаў уваходзіць у таварыства аховы прыроды і колькі атрымлівае стыпендыю. А ўжо пра лічбы, што ўвасабляюць сумы, якія выдаткоўвае наша дзяржава на падрыхтоўку аднаго спецыяліста, сорамна не ведаць нават першакласніку. Пра студэнта дык і гаворкі няма.

І ўсё ж ёсць яшчэ «белыя плямы», над якімі не задумваўся звышсучасна-электронны мозг камп'ютэра. Бытуюць з'явы, не занесеныя яшчэ дагэтуль ні на адну перфастужку.

Хто возьме на сябе смеласць сказаць, колькі студэнтаў здае сесіі шчыра, «з галавы», а колькі падманам — па шпаргалках?

А што прафесар? А што прафесар... Ён адзін, а іх — 25. Ён пільна слухае адказ і яшчэ больш уважліва сочыць за тымі чатырма, што рыхтуюцца. Яны, у сваю чаргу, пільна сочаць за прафесарам і чакаюць... Варта толькі экзаменатару апусціць вочы, і ён прайграў. Праз тры хвіліны — звярайце па гадзіннніку — непатрэбная ўжо «шпора» ляжа на дно кішэні. А ў вачах студэнта засвецяцца глыбокія веды па прадмету...

Шпаргалка — ветразь, які прагне берага пад кодавай назвай «Стыпендыя». Што толькі не ставіць студэнт на карту, каб дасягнуць гэтай мэты?! Вечар танцаў — на вечар перанясення зместу канспекта на папяровы «гармонік» даўжынёй у паўтара метра. Колерамузыку дыскатэкі — на цьмяную чырвань фоталабараторыі, дзе курс лекцый па матаналізу ўмяшчаецца на стосе фотакопій памерам з калоду карт...

Як бачна, «шпора» — не толькі ветразь, яна яшчэ і выратавальны круг. І каб набыць яго, адзін ахвяруе ўласным сном, вольным часам, ну і яшчэ сумленнем, а іншы...

Раней чым чытач даведаецца, што прыносіць у ахвяру некаторая катэгорыя студэнтаў, проста неабходна зрабіць адступленне і што-кольвечы растлумачыць.

Вось з падполля ў кнігасховішча трапляюць раптам падручнікі, псуюць там без разбору навуковую і мастацкую літаратуру, класіку і творы сучасных аўтараў. Возьмем гэта за агульнае. Вядома, што зробяць у такім выпадку работнікі галоўнага корпуса універсітэта. Яны падрыхтуюць для шэрых зламыснікаў ежу з атрутаю. Можа хто з пацукоў і не чапаў тыя скаромныя старонкі навукова-папулярнай літаратуры, але ад каўбас пасля нішчымніцы хто адмовіцца? Так з-за агульнай нянавісці людзей да грызуноў пацерпіць кожны прыватны пацучыны інтарэс...

Ну дык вось, іншыя студэнты ставяць на карту ў ноч перад экзаменам сваю чалавечую годнасць. І аказваецца яна... адэкватнай пацуковай. Таму што назаўтра, па дарозе на экзамен, заходзяць такія з дазволу сказаць студэнты ў чытальную залу бібліятэкі галоўнага корпуса... не, не пачытаць, не асвяжыць у памяці забытае перад інтэлектуальным боем «студэнт — прафесар». А каб пад шорах старонак вынесці прысуд нелюбімаму прадмету. І з адпаведнага падручніка, ваўкавата азіраючыся па баках, адной левай выдзірае такі індывід дзесяткі лістоў. З тэмай, пра якую ён мае такое ж уяўленне, як і пра нораў каня Аляксандра Македонскага.

Прыклад, калі з-за ўласнага дзікунства (інакш і не скажаш) пакутуе агульны інтарэс. Сам жа зламыснік, распіхаўшы па кішэнях старонкі з тэкстам у друкарскім выкананні, кіруецца на экзамен. Быццам так і трэба. Быццам і не было злачынства. Замаху на дзяржаўную маёмасць, працу людзей. А пасля, атрымаўшы ў залікоўцы добра або нават выдатна, пойдзе ў дальні кут калідора вытрушваць у сметніцу непатрэбныя ўжо аркушы. А каб усе ўлезлі — нагой іх, нагой!

Такім чынам, сама з'ява існуе. І на фоне добрасумленных студэнтаў шкоднікі, як стала вядома, складаюць не такі ўжо мізер. Але вось затрымаць, схапіць злодзея за руку... Пакуль, на жаль, не. Спрыту не хапае ў жанчын з ліку работнікаў бібліятэкі. Калі на тое, то ці гэтым яны абавязаны займацца? Тут, як кажуць, у наяўнасці састаў злачынства. А гэта ўжо справа іншых работнікаў.

А пакуль справа да адпаведнай справы не дайшла, самы час задумацца нам з вамі. І нават не над падзеямі даўно мінулых дзён. Над тым, што адбылося зусім нядаўна.

Літаральна на мінулым тыдні ў чытальнай зале галоўнага корпуса была афармлена кніжная выстаўка «Студэнтам — да палізаліку». Работнікі бібліятэкі радаваліся — аблегчылі клопат наведвальнікам, патурбаваліся аб культуры абслугоўвання. Нават адзіны экземпляр «Нарысаў па гісторыі Ленінскага камсамола» як сцяг узнеслі на памянёную паліцу. А праз два дні з кнігі знікла больш за трыццаць старонак...

Пракаменціраваць гэты факт цяжка да немагчымасці. Слоў не хапае. Яны губляюцца ў патоку эмоцый...

Таму ў заключэнне хочацца сказаць аб іншым. Былі экзамены. Не ў пустыні жывём. Нехта ж бачыў, як зламыснікі на розных факультэтах насілі, карысталіся, можа нават пазычалі ў карыстанне, а потым выкідвалі, шчаслівыя пасля экзамена, лісты з бібліятэчнымі штампамі ў сметніцу. А хто сказаў такому аднакашніку: «Што ж ты робіш?!». Хто спытаў аб наяўнасці сумлення?

Будзе палітзалік. І нехта невядомы стане на вачах усёй групы перабіраць старонкі з «Нарысаў па гісторыі Ленінскага камсамола». Каб адказаць на пытанні. Каб атрымаць высокую адзнаку. Магчыма, нават выдатную. І калі за яе прагаласуе група, уся яна заслугоўвае аднаго — «нездавальняюча». За беспрынцыповасць, за адсутнасць абавязковай для кожнага камсамольца патрабавальнасці.

В. ГРАМОВІЧ,
наш кар.

ЭФЕКТЫЎНЫ СРОДАК

На нядаўнім пасяджэнні Палітбюро ЦК КПСС усебакова абмеркавала пытанне аб барацьбе з п'янствам і алкагалізмам. Адобраны прапановы па ўдасканаленню заканадаўства, накіраванага на барацьбу з гэтай ненармальнай з'явай.

АДНЫМ З НАЙБОЛЬШ шкодных перажыткаў мінулага з'яўляецца п'янства. Цяжка падлічыць тую маральную, фізічную і матэрыяльную шкоду, якую п'янства прыносіць нашаму грамадству. Медыцына мае пераканаўчыя доказы таго, што алкаголь вядзе да дэградацыі асобы, да нервовых і псіхічных захворванняў. Па даных Сусветнай арганізацыі аховы здароўя за апошнія гады рэзка ўзрасла смяротнасць ад алкагалізму і ў многіх краінах уступае толькі смяротнасці ад сардэчна-сасудзістых захворванняў і рака.

П'янства з'яўляецца вялікім няшчасцем для сям'і. Вывучэнне судовай практыкі па грамадзянскіх справах аб разводах паказала, што злоўжыванне спіртнымі напіткамі — найбольш распаўсюджаная прычына распаду сем'яў. У сем'ях, дзе бацькі п'янствуюць, дзеці, як правіла, дрэнна вучацца, становяцца на шлях правапарушэнняў.

П'янства наносіць вялікі матэрыяльны ўбытак дзяржаве. З-за п'янства нярэдка дапускаецца брак на вытворчасці, адбываюцца траўматызм, няшчасныя выпадкі, 90 працэнтаў усіх прагулаў таксама па прычыне п'янства. Аўтатранспартныя прадпрыемствы выплачваюць немалыя сумы асобам, якія атрымалі калецтвы ў выніку дарожных здарэнняў, што адбыліся па віне п'янага вадзіцеля.

П'янства цесна звязана з другім сацыяльным злом — злачыннасцю. Даныя судовай статыстыкі сведчаць аб тым, што кожнае другое злачынства здзяйсняецца асобамі ў стане ап'янення. Выбарачныя даследаванні, праведзеныя Акадэміяй МУС СССР, паказалі, што на дні ўзмоцненага ўжывання спіртных напіткаў (субота, нядзеля) даводзіцца 33 працэнты хуліганскіх дзеянняў, 48 працэнтаў нанясення цялесных пашкоджанняў і 50 працэнтаў забойстваў.

Вялікі рускі пісьменнік А. М. Талстой адзначаў, што «рэдкі злодзей, забойца робіць сваю справу цвярозым». Сёння са 100 забойстваў з хуліганскіх намераў 96 здзяйсняюцца асобамі, якія знаходзяцца ў нецвярозым стане.

Пастановай ЦК КПСС «Аб паляпшэнні работы па ахове правапарадку і ўзмацненні барацьбы з правапарушэннямі» перад партыйнымі, савецкімі, праваахоўнымі і іншымі дзяржаўнымі органамі і грамадскімі арганізацыямі пастаўлена важнейшая задача — паслядоўна і настойліва весці барацьбу супраць п'янства і алкагалізму, ажыццяўляць больш дзейсныя меры па прафілактыцы п'янства.

У сістэме прававых мер барацьбы з п'янствам важнае месца займаюць меры грамадзянска-прававога характару, прадугледжаныя артыкулам 17 Грамадзянскага кодэкса БССР. Гэта прававая норма дае суду права абмяжоўваць у дзеяздольнасці грамадзян, якія злоўжываюць спіртнымі напіткамі і тым самым ставяць сваю сям'ю ў цяжкае матэрыяльнае становішча.

Асобы, прызнаныя па рашэнню суда абмежавана дзеяздольнымі, не маюць права без згоды апекуна прадаваць, абменьваць, купляць маёмасць, ажыццяўляць здзелкі па распараджэнню маёмасцю. Гэта асоба не мае таксама права без згоды апекуна атрымоўваць сваю заработную плату, пенсію і іншыя віды даходаў. Здзелкі, ажыццёўленыя абмежавана дзеяздольнай асобай без згоды апекуна, прызнаюцца несапраўднымі.

Закон устанаўлівае кола асоб, якія могуць звяртацца ў суд з заявамі аб абмежаванні дзеяздольнасці грамадзяніна: члены яго сям'і, прафсаюзныя і іншыя грамадскія арганізацыі, пракурор, арганізацыі апекі, псіхіятрычныя лячэбныя ўстановы.

Большасць такіх спраў (каля 80 працэнтаў) узбуджаюцца ў судах па заяве пракурора. Прафсаюзныя камітэты і іншыя грамадскія арганізацыі рэдка выкарыстоўваюць дадзенае ім законам права звяртацца ў суд з заявай аб прызнанні грамадзяніна абмежавана дзеяздольным. У нейкай ступені гэта тлумачыцца недастатковым веданнем існуючага заканадаўства.

Заява падаецца ў суд па месцы жыхарства грамадзяніна, які злоўжывае спіртнымі напіткамі. Закон вызваляе ад уплаты дзяржпошліны пры падачы заявы і ад іншых судовых расходаў па вядзенню справы.

Абмежаванне дзеяздольнасці з'яўляецца эфектыўным сродкам у барацьбе з п'янствам. Праверка эфектыўнасці судовых рашэнняў аб абмежаванні дзеяздольнасці, вынесеных народнымі судамі г. Мінска, паказала, што ў большасці выпадкаў грамадзяне, прызнаныя абмежавана дзеяздольнымі, спынілі злоўжыванне спіртнымі напіткамі, палепшылі свае паводзіны ў сям'і, сталі добрасумленна адносіцца да выканання працоўных абавязкаў.

В. ЦІХІНЯ,
старшыня савета прававога выхавання і прафілактыкі правапарушэнняў БДУ імя У. І. Леніна.

Шлях у краіну здароўя

ЗАЛЕЖЫЦЬ АД ЦЯБЕ

(Заканчэнне. Пачатак у № 10 за 21 сакавіка 1985 г.).

У «Литературной газете» быў прыведзены кароткі аналіз асноўных палажэнняў кнігі заходнегерманскага пісьменніка Манфрэда Кёнлехнера «Сем прынцыпаў захавання здароўя».

Вось яны.

Правільна дахаць. Засвойце нескладаныя практыкаванні ёгаў, дыхальную тэрапію, гімнастыку. Смех, крыкі, спевы таксама садзейнічаюць аздараўленню. Часцей гуляйце ў лесе, полі, дыхайце чыстым паветрам.

Правільна піць. Піце штодзень каля 2,5 літра вады. Толькі ў гэтым выпадку арганізм зможа пазбаўляцца ад шлакаў.

Правільна есці. Нерацыянальнае харчаванне — прычына 30 працэнтаў выпадкаў смерці. Не загружайце страўнік на ноч. Падтрымлівайце нармальную вагу цела. Ужывайце пераважна свежыя прадукты. Есці патрэбна ў адзін і той жа час.

Правільна рухацца. Фізічныя заняткі трэніруюць сэрца, даюць дадатковую энергію. Займайцеся ў першую чаргу бегам. Спачатку хопіць 15—20-мінутнай прабежкі. Перад ёю добра пахадзіць у хуткім тэмпе. Вельмі карысныя катанне на лыжах, веласіпедзе, танцы. Не захапляйцеся тэлевізарам. Не ездзіце на ліфце, хадзіце на работу пешшу.

Правільна расслабляцца. Каб супрацьстаяць дзеянню стрэсаў, патрэбна навучыцца своечасова расслабляцца, паўнацэнна адпачываць не толькі ў час водпуску, але і на працягу года. Авалодвайце аўтагеннай трэніроўкай. Не прымайце снатворнага на ноч, а раніцай не піце моцны кофе і чай.

Правільна берагчыся. Прафілактыка захворванняў павінна ажыццяўляцца з ранняга дзяцінства. І ўсё ж ёю заняцца ніколі не позна. Жывіце прасцей, больш натуральна, дысцыплінавана. Каб зберагчыся ад інфаркта, не курыце, ешце страву, у якой мала тлушчаў, больш рухайцеся.

Правільна думаць. Настрой, думкі адбіваюцца на здароўі. Правільна думаць — значыць умець прыводзіць думкі ў парадак, накіроўваць іх упэўнена і свядома ў пазітыўны бок. Розум, псіхіка, душэўны стан узаемазвязаны. Важную ролю ў захаванні здароўя адыгрывае самаўнушэнне. Яно тым мацнейшае, чым больш мы верым у яго сілу.

А вось ці робім мы самі ўсё, каб быць здаровымі і працаздольнымі?

У адносінах да свайго здароўя ўсіх людзей можна раздзяліць на шэраг груп.

«Марнатраўцы жыцця». Людзі гэтай групы звычайна кураць, ужываюць алкаголь, не сочаць за распарадкам дня, сваім сном, ядзяць як давядзецца, мала рухаюцца і многа хвалююцца, не ўмеюць правільна адпачываць. Яны могуць быць добрымі работнікамі на прадпрыемстве, прадукцыйнымі навуковымі работнікамі, але іх лад жыцця хутка прыводзіць да такіх захворванняў, як гіпертанія, язвенная хвароба страўніка і іншых. Іменна ў такіх людзей ужо ў параўнальна маладым узросце могуць быць такія захворванні, як інфаркт міякарда, кровазліццё ў мозг. Такі спосаб жыцця часта называюць «запаволеным забойствам».

Другая група — група **«пасіўных утрыманцаў ад здароўя»** — складаецца з людзей, якія задумваюцца над тым, што урэшце нядрэнна было б быць здаровым чалавекам, але нічога канкрэтна не робяць для гэтага. Лянота, безыніцыятыўнасць у адносінах да свайго здароўя паступова прыводзяць да страты патэнцыяльных абаронных сіл арганізма і паяўлення «узроставых хвароб». Пры захворванні такія людзі думаюць не аб тым, што іх лад жыцця прывёў да хваробы, і не імкнуцца выправіць становішча, а спяшаюцца ў паліклініку да ўрачоў.

Група **«дрыжачых зайцоў».** Людзі гэтай групы занепакоены тым, каб не захварэць. Яны ўвесь час шукаюць у сябе тую ці іншую хваробу, цікавяцца медыцынскай літаратурай, чытаюць пра тыя ці іншыя захворванні, з ахвотай слухаюць скаргі сваіх сяброў ці родных. Яны праводзяць аналогі іх стану са сваім і пераконваюцца, што ў іх таксама не ўсё добра са здароўем. Навіна аб чыёй-небудзь смерці ад інфаркта даводзіць іх да шоку. Яны пачынаюць прыслухоўвацца да работы свайго сэрца і адзначаюць, што яно ў іх баліць. У доме, сумках, кішэнях гэтых людзей з'яўляюцца так званыя сардэчныя лекі. Яны добраахвотна запісваюцца ў члены «валідольнай каманды», дакучаюць урачам бясконцымі скаргамі, а пры абследаванні ў іх нічога не знаходзяць. Гэта іх раздражняе. Яны хочуць, каб у іх знайшлі якую-небудзь хваробу.

Група **«эпізадычных актывістаў».** Напэўна, гэта самая шматлікая група. Людзі, якія ўваходзяць у яе, абцяжараны пачуццём віны перад сваім здароўем. Яны пастаянна думаюць, што патрэбна заняцца сваім здароўем ушчыльную. Прызначаюць жорсткія тэрміны, калі яны зоймуцца ранішняй зарадкай, бегам, плаваннем і г. д. Але тэрміны праходзяць, а справа не рухаецца. І ўсё ж нарэшце ў адзін цудоўны дзень планы пачынаюць ажыццяўляцца. Тыдзень-другі ўсё ідзе цудоўна. Зарадка надае новыя сілы, прагулкі пешшу, бег, басейн робяць сваю справу. Чалавек адчувае сябе лепш. Ён даходзіць нарэшце да таго, што пачынае праходзіць міма ліфта і хутка прыгае па лесвіцы на пяты, а то і на дзевяты паверх. Але гэтага хапае ненадоўга. Нарэшце ўсё пачынаецца спачатку.

Група **«вузкіх спецыялістаў»** — гарачыя прыхільнікі адной якой-небудзь сістэмы, метаду. У гэтых адносінах яны даходзяць да фанатызму. Сістэматычна займаючыся сваім метадам, яны, бясспрэчна, дабіваюцца добрых вынікаў. Пераконваюцца, што толькі так, а не іначай патрэбна ўмацоўваць сваё здароўе. Актыўна прапагандуюць свае заняткі.

Да гэтай групы можна аднесці і вылучыць у якасці своеасаблівай падгрупы **«вузкіх спецыялістаў экзатычнага плана».** Гэта аматары ёгі, дыхальных практыкаванняў... Цяжка, ды і не патрэбна пераконваць такіх людзей. Яны ж дасягаюць сваёй мэты. Аднак патрэбна сказаць, што «вузкія спецыялісты», займаючыся па больш шырокай праграме, маглі б дасягнуць значна лепшых поспехаў.

Група **«гарманічных актывістаў».** На жаль, гэта група не такая шматлікая, як хацелася б. Безумоўна, веданне і пастаяннае прымяненне адразу некалькіх метадаў самаўздзеяння дапаможа дасягнуць лепшых вынікаў і ў больш кароткі тэрмін. Аднак, дасягнуўшы добрых рэзультатаў, не патрэбна пераходзіць у групу «эпізадычных актывістаў». Заняткі патрэбна праводзіць пастаянна. А калі ўсё будзе так, то гэта ўжо не заняткі, якія «адпрацоўваюць», а новы спосаб жыцця, свой выпрацаваны стыль.

Толькі ўсё гэта добра, калі ты нарадзіўся і вырас моцным і здаровым. А што рабіць тады, калі з дзяцінства цябе не пакідалі хваробы? Або яны набыты на працягу жыцця...

Вопыт паказвае, што бязвыхадных сітуацый няма. Прывядзём прыклады. А. Суворaў з дзяцінства быў аслабленым, кволым хлопчыкам. Сістэматычна займаючыся загартоўваннем, фізічным удасканаленнем свайго здароўя, ён здолеў стаць дужым і вынослівым. Ужо ў сталым узросце ўдзельнічаў разам з салдатамі ў пешым пераходзе цераз Альпы.

Вядомы філосаф І. Кант таксама нарадзіўся вельмі слабым, увесь час хварэў. Урачы гаварылі, што ён памрэ, не дажыўшы да паўналецця. Аднак воля, напорыстасць, жалезны распарадак жыцця зрабілі цуд. Вядома, што І. Кант памёр у даволі сталым узросце. На працягу жыцця ён ніколі не хварэў.

Амерыканскі ўрач Поль Брэг у семнаццаць гадоў памiраў ад туберкулёзу. З дапамогай сваіх метадаў лячэння, і ў тым ліку галадання, ён пераадолеў хваробу. Умацоўваючы сваё здароўе шляхам сістэматычнага перыядычнага галадання, загартоўвання і фізічнай актыўнасці, ён стаў своеасаблівым чэмпіёнам свету па здароўю. У 80 гадоў ён пешшу пераадолеў Пустыню Смерці, што ў Каліфорніі. У самы гарачы месяц лета, калі тэмпература там была больш за 50 градусаў, ён прайшоў гэтую пустыню туды і назад, пераадолеўшы больш за 100 кіламетраў шляху за два дні.

Такіх прыкладаў можна прывесці многа. Усё гэта яшчэ раз пераконвае ў тым, што ў любым выпадку здароўе сваё можна палепшыць. Было б жаданне.

Ю. МЕРЗЛЯКОЎ.
урач.

БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

Мінская паліграфічная фабрыка «Красная звезда» МВПА імя Я. Коласа.

11 красавіка 1985 г.
Зак. 2426. АТ 13276.

220080, МІНСК-80, УНІВЕРСІТЭЦКІ ГАРАДОК, ГЕАГРАФІЧНЫ КОРПУС, п. 3.

ТЭЛЕФОН 20-68-27.

Рэдактар
В. П. ВАРАБ'ЁЎ